ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1986
19
ЧЭРВЕНЯ
№ 22 (1508)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Беларускі універсітэт
## ТЭЛЕТАЙП
«УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА»

### ЛЕТНІ ЭТАП

студэнцкай спартакіяды вышэйшых навучальных устаноў БССР пройдзе ў пачатку ліпеня на спартыўных пляцоўках Гродна. Адбудуцца спаборніцтвы па мастацкай гімнастыцы, баскетболу, валейболу, веласпорту, спартыўнаму арыентаванню, плаванню, лёгкай атлетыцы. Нагадаем, што пасля зімовага этапа спартакіяды зборная нашага універсітэта займае V месца, набраўшы 296 ачкоў.

А. СЦЯПАНАЎ.

### АДЗІНЫ ПАЛІТДЗЕНЬ

прайшоў ва універсітэце з парадкам дня «Аб праекце ЦК КПСС «Асноўныя напрамкі перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне».

Т. РУДКОЎСКАЯ.

### РЭКТАРАТ І ПАРТКОМ

правялі сумеснае пасяджэнне, на якім усебакова абмеркаваны праект ЦК КПСС «Асноўныя напрамкі перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне».

А. САЎЧЫК.

### РЫХТУЮЦЦА

выступіць з канцэртнай праграмай перад пацярпеўшымі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, якіх прыняў прафілакторый універсітэта, агітбрыгада «Фенікс» і фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Неруш».

Г. СВЯТЛЯК.

### У ФОНД

пацярпеўшых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС супрацоўнікі універсітэта пералічылі грошай на суму больш як 20 тысяч рублёў. Збор сродкаў працягваецца.

А. САВІЧ.

### ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ

рэспубліканскага конкурсу студэнцкіх навуковых работ. Дыпломамі МінВНУ БССР узнагароджаны і рэкамендаваны на Усесаюзны конкурс работы студэнтаў механіка-матэматычнага факультэта Нгуен Ван Хоа, Ю. Белацаркоўскага, В. Рабцэвіча.

І. БУЛАШ.

### ДА ЎВАГІ

усіх чытачоў універсітэцкай бібліятэкі! Таварышы, памятайце, што кнігі — гэта наша агульная скарбонка, адносьцеся да іх не толькі беражліва, але і здавайце ў тэрмін!

А. ВІХРОВА.

## ШЧАСЛІВАЙ ДАРОГІ, ВЫПУСКНІК!



*ТАЦЦЯНА ХАЦЯТОЎСКАЯ рыхтуецца да педагагічнай дзейнасці. Яна — выпускніца ММФ. За гады вучобы ва універсітэце Таццяна сур'ёзна падыходзіла да сваёй будучай прафесіі, вучылася на «добра» і «выдатна», актыўна удзельнічала ў грамадскім жыцці — апошнія гады ўзначальвала вучэбна-вытворчую камісію студэнцкага прафкома.*

*«Калі адказна падыходзіць да сваёй мары, яна абавязкова здзейсніцца», — лічыць Таццяна.*

*Фота А. ВАЛОШЫНА.*

## ВЫШЭЙШАЯ ШКОЛА: АБМЯРКОЎВАЕМ ПРАЕКТ ПЕРАБУДОВЫ

У вырашэнні задач паскарэння эканамічнага і сацыяльнага прагрэсу нязмерна ўзрастае значнасць выхавання гарманічна развітой, грамадска актыўнай асобы спецыяліста, узмацнення ідэйна-выхаваўчых функцый вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай школы.

(З праекта ЦК КПСС «Асноўныя напрамкі перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне»).

## РАЗВІВАЦЬ АКТЫЎНАСЦЬ

СВАЮ ГАЛОЎНУЮ задачу юрыдычны факультэт Белдзяржуніверсітэта бачыць у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў з вышэйшай юрыдычнай адукацыяй. Выпускнік юрыдычнага факультэта павінен валодаць сучаснымі прававымі ведамі, умець правільна выкарыстоўваць іх у будучай рабоце, глыбока ведаць савецкае заканадаўства, практыку яго прымянення і тэндэнцыі развіцця. Але гэтага далёка недастаткова. Яшчэ У. І. Ленін указваў, што законы важныя не тым, што яны запісаны на паперы, але тым, хто іх праводзіць. Спецыяліст-юрыст, як і іншы выпускнік вышэйшай школы, павінен валодаць высокімі палітычнымі, дзелавымі і маральнымі якасцямі. У праекце ЦК КПСС «Асноўныя напрамкі перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне» адзначаецца ўзрастаючае значэнне выхавання гарманічна развітой, грамадска актыўнай асобы спецыяліста, узмацнення ідэйна-выхаваўчых функцый вышэйшай школы. Прафесарска-выкладчыцкім калектывам, партыйным, камсамольскім і прафсаюзным арганізацыям вышэйшых навучальных устаноў патрэбна ўзмацніць работу па ідэйна-палітычнаму, працоўнаму і маральнаму выхаванню студэнцкай моладзі.

Сістэма ідэалагічнай і палітыка-выхаваўчай работы на факультэтах ВНУ уключае вучэбны працэс, работу дэканата, кафедраў, партыйнай, камсамольскай, прафсаюзнай і іншых грамадскіх арганізацый, студэнцкіх атрадаў і г. д. Праект ЦК КПСС абавязвае эфектыўна выкарыстоўваць увесь арсенал форм і метадаў выхаваўчай дзейнасці.

Перабудова вышэйшай адукацыі ў краіне азначае таксама абнаўленне зместу, форм і метадаў ідэйна-выхаваўчай работы у ВНУ.

Важную ролю ў ідэйна-выхаваўчай рабоце іграюць кафедры. Яны аказваюць уплыў на свядомасць студэнтаў як у вучэбным працэсе, так і па-за ім. У нас назапашаны свой вопыт замацавання кафедраў за пэўнымі курсамі. Яны замацоўваюцца за тымі курсамі, дзе выкладаюцца ўсе ці большасць дысцыплін кафедры. З выкладчыкаў кафедры, якая курыруе, назначаюцца і куратары на курсе. Такая практыка выключае «абязлічванне» у ідэйна-выхаваўчай рабоце, дазваляе бачыць і аналізаваць вынікі. Павышаецца адказнасць, кафедра становіцца арганізатарам ідэйна-выхаваўчай работы на курсе.

Асновай ідэйнасці, баявітасці і творчай актыўнасці камсамола з'яўляецца партыйнае кіраўніцтва. Аднак тут нельга дапускаць лішнюю рэгламентацыю і апеку, а тым больш падмену. Патрэбна развіваць самастойнасць камсамольцаў, пачуццё адказнасці, фарміраваць навыкі грамадскай работы і арганізатарскія здольнасці. Неабходна заахвочваць імкненне моладзі праяўляць сябе ў розных галінах грамадскага жыцця, разумную ініцыятыву камсамольцаў, пашыраць студэнцкае самакіраванне. Падтрымліваю палажэнне праекта ЦК КПСС аб поўнай перадачы ў кампетэнцыю студэнцкіх арганізацый пытанняў грамадска карыснай працы, быту, адпачынку студэнтаў, падтрымання парадку ў інтэрнатах і сталовых, вучэбных аўдыторыях і бібліятэках.

Праект ЦК КПСС ставіць у цэнтр выхаваўчай работы індывідуальны падыход да развіцця асобы будучага спецыяліста. Сапраўды, ідэйна-выхаваўчая работа часта вядзецца ўвогуле, а не ў разліку на канкрэтнага чалавека. Таму яна і не дае таго эфекту, якога ад яе чакаюць. У справе выхавання патрэбна максімальная канкрэтнасць. Індывідуальны падыход да выхавання прадвызначае веданне якасцей асобы кожнага студэнта як станоўчых, так і адмоўных. Толькі ў гэтым выпадку можна, абапіраючыся на станоўчае ў асобе студэнта, паспяхова пераадолець яго адмоўныя рысы. Напрыклад, можна даць студэнту такое грамадскае даручэнне, якое адпавядае асабістым інтарэсам і будзе выконвацца з пачуццём задавальнення.

Для вядзення індывідуальнай работы выкладчык павінен мець неабходныя ўмовы. У гэтых мэтах у праекце ЦК КПСС плануецца паменшыць колькасць студэнтаў, якія прыходзяцца на аднаго выкладчыка. Прадугледжваецца таксама, што практычныя, семінарскія і лабараторныя заняткі павінны праходзіць, як правіла, у групах колькасцю да 15 чалавек. Але апошняе палажэнне будзе паслядоўна выконвацца, на наш погляд, толькі тады, калі і акадэмічныя групы будуць такімі ж па колькасці. Таму прапаную запісаць у раздзеле III праекта ЦК КПСС больш канкрэтна: «Камплектаваць акадэмічныя групы колькасцю не больш за 15 чалавек».

В. ГАДУНОЎ,
сакратар партбюро юрыдычнага факультэта.

## ЗМАГАЦЦА ЗА ЯКАСЦЬ

У ПРАЕКЦЕ ёсць вельмі многа важных палажэнняў і канкрэтных мер, накіраваных на карэннае паляпшэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. Аднак мне хацелася б вылучыць, на мой погляд, найбольш істотны момант: «выключыць у ацэнцы ведаў студэнтаў праявы працэнтаманіі і фармалізму. Ліквідаваць залежнасць колькасці выкладчыкаў ад адсеву навучэнцаў».

Нашым галоўным ворагам з'яўляецца «яе вялікасць тройка», якая ў большасці выпадкаў мала чым адрозніваецца ад «двойкі». Пры гэтым пераважная большасць нядбайных студэнтаў ведае, што «свае тры балы» яны абавязкова атрымаюць, няхай не з першага разу, дык з другога ці трэцяга. У выніку мы выпускаем не высокакваліфікаванага спецыяліста, а адну назву, або, як кажуць будаўнікі, «аб'ект здадзены з недаробкамі».

Адзначанае вышэй палажэнне праекта павысіць адказнасць студэнта за якасць сваёй падрыхтоўкі і сваіх ведаў. Бо без асабістага жадання самога студэнта якасць яго падрыхтоўкі не змогуць палепшыць ні высокае майстэрства выкладчыка, ні дарагое абсталяванне.

І другі момант. Ён датычыць завочнага навучання. Усім зразумела, што ўзровень дзённай формы навучання значна вышэй узроўню завочнага. Аднак выпускнікі таго і другога аддзяленняў атрымліваюць аднолькавыя дыпломы. І, што вельмі несправядліва, карыстаюцца аднолькавымі правамі пры паступленні на работу. Патрэбна карэннае паляпшэнне якасці завочнага навучання, яго форм і метадаў.

М. АПІШЧАНКА,
асістэнт кафедры спектраскапіі і квантавай электронікі, член камітэта камсамола супрацоўнікаў і выкладчыкаў.

## ТСН. Чаму не выкарыстоўваем?

У ПАВЫШЭННІ ЯКАСЦІ вучэбнага працэсу вялікая роля належыць тэхнічным сродкам навучання. Неабходная колькасць іх ва універсітэце ёсць. Але як яны выкарыстоўваюцца?

Штогод мы звяртаемся да факультэтаў, кафедраў з просьбай падаваць заяўкі на патрэбныя ім ТСН. І тут сутыкаемся ці то з маўчаннем, ці з вялікай «непісьменнасцю». У заяўках ёсць прылады, якія да ТСН ніякіх адносін не маюць. Сутыкнуўшыся з такой праблемай, мы вырашылі стварыць кансультацыйны пункт, дзе б жадаючыя маглі пазнаёміцца з сучасным станам ТСН, даведацца, якія тэхнічныя сродкі ёсць ва універсітэце і як іх можна выкарыстоўваць і г. д. Але за год існавання такога пункта ні адзін выкладчык яго не наведаў!

Каб справа зрушылася ў лепшы бок, выкладчыку патрэбна быць больш актыўным і зацікаўленым у гэтай справе. А мы ў сваю чаргу гатовы прыняць самы дзейны ўдзел у набыцці і укараненні ТСН, рамонце тэхнічных сродкаў. Зараз лабараторыя тэхнічных сродкаў дапамагае хімічнаму факультэту ўстанаўліваць тэлевізійна-аудыторны комплекс і будзе дапамагаць у яго эксплуатацыі. Мы адгукнуліся на прапанову кафедры замежных моў абсталяваць на геафаку кабінет для вывучэння замежных моў на базе кантрольна-навучальнай сістэмы «Эўрыка».

«Тэхнічнае перааснашчэнне вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай школы — абавязковая ўмова павышэння эфектыўнасці яе дзейнасці — адзначаецца у праекце ЦК КПСС «Асноўныя напрамкі перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне». Ва універсітэце патрэбна не толькі больш і лепш выкарыстоўваць ТСН, але і змяніць адносіны да іх многім выкладчыкам.

А. КУТАСАЎ,
загадчык лабараторыі ТСН.

Дружбы ранак
Літаратурная старонка

### *Галіна РАКОЦА*

**НАРАДЖЭННЕ**

У туманах спавітая,
Ад калін — ірдзяная,
Ад завеяў — белая,
Пчолкаю працавітаю
Святло
Зямля
Мая
Сеяла!
Рассыпаліся косці яшчараў прахам.
Святло прарастала коласам,
Святло прарастала птахам.
А зямля даверная, босая,
Немаўля пад сэрцам насіла.
Ножкамі біла маленькае —
Ўбірала матчыну сілу.
Удыхала сілу матчыну
Па крупіцы з кожнага веку...
..Неаплачанай спадчынай
Святло прарасло ў чалавеку!

### *Алесь ХАМІЧУК*

**ЛЕТО**

*Звонкий дождь серебряною птицей*
*Прилетел из синей высоты.*
*Лужи расплескал и дал напиться*
*Ласковой реке, где дугами мосты.*

*Вдруг из толстой тучи солнце улыбнулось,*
*Желтыми лучами брызнуло с небес.*
*От улыбки теплой радуга загнулась*
*И запел счастливо чистый, старый лес.*
*Захотелось ветру в поле прогуляться,*
*Выплеснуть на берег тихую волну,*
*И пошел бродяга небом любоваться,*
*Шелестом пугая лета тишину.*



### *Іна ЯЦУХНА*

*Крылаты, як вецер, паэзіі сімвал — Пегас.*
*Гэта ты закрычаў над палаючай, зломленай Трояй.*
*Гэта ты над Хатынню ў роспачы крылы ламаў.*
*Белы конь, жарабятка з буслінаю тонкаю шыяй,*
*То ён мірна пасецца, рве кветкі і топча траву,*
*А то раптам уздыме магутныя ветразі-крылы*
*І імчыцца туды, дзе выстукваюць сэрцы бяду.*

### *Жанна ПАХОДНЯ*

**ПАМЯЦЬ**

Кіпучая ці ільдзістая — памяць,
Замутнелая ці празрыстая — памяць,
Журлівая ці ўрачыстая — памяць,—
Слядоў незваротных замець...
Не адчысціць яе, не запляміць,
І нічога ў ёй не паправіць!

### *Алена СТОРАЖАВА*

**МАМА**

Я гукаю... Як адгукнецца?
Я шукаю... Хто адзавецца?
Хто падыдзе, паспачувае,
Хто суцешыць-паспагадае?
Мама?
— Не маленькая, абыдуся...

Абышлася. Бяда ж — не мінула...
Не стрываю — сэрцам адчула,
І пабегла, і закрычала...
...Як я клікала, як шукала:
— Мама!

— Ах, дачушка,
З зямлі не ўзнімуся...
Ты ж сказала мне:
«Абыдуся».

# НА МОВЕ ДРУЖБЫ

**Літаратурная творчасць мае шмат адценняў і граняў. Адна з іх — перакладчыцкая праца, якая патрабуе не толькі дасканалага вывучэння мовы арыгінала. Сёння на пытанні адказвае выпускнік БДУ імя У. І. Леніна і стажор Тбіліскага дзяржаўнага універсітэта Уладзімір СІЎЧЫКАЎ.**

**— Валодзя, давайце пачнём з гісторыі. Калі ласка, раскажыце спачатку пра ўзаемакантакты літаратур народаў Грузіі і Беларусі.**

— Беларуска-грузінскія літаратурныя ўзаемасувязі маюць даўнія традыцыі. Адзначу толькі пэўныя моманты, назаву некаторыя імёны і даты. Першыя звесткі пра грузінаў у беларускай літаратуры змяшчаюцца ў «Хаджэнні ў Царград і Іерусалім» Ігнація Смаляніна (канец 14 ст.). Даволі рана былі перакладзены на грузінскую мову творы Кірылы Тураўскага і Сімеона Полацкага. З Грузіяй звязаны лёс беларускага паэта-рэвалюцыянера Франца Савіча, а ў тагачасным Тыфлісе пачынаў працоўную і літаратурную дзейнасць Янка Лучына.

Значна пашырыліся беларуска-грузінскія культурныя сувязі ў паслякастрычніцкі час. У выніку абмену пісьменніцкімі дэлегацыямі (1935 г.) былі напісаны раман Э. Самуйлёнка «Будучыня», прысвечаны жыццю грузінскага народа, і цыкл апавяданняў К. Лордкіпанідзе пра барацьбу беларусаў у часы грамадзянскай вайны. Цікавая старонка творчасці народнага паэта Беларусі Янкі Купалы — удзел у святкаваннях 750-годдзя паэмы Ш. Руставелі «Віцязь у тыгравай шкуры», дні, праведзеныя паэтам у Цхалтуба, і яго вершы, прысвечаныя Грузіі.

Некаторыя грузінскія пісьменнікі змагаліся з фашысцкімі захопнікамі за вызваленне Беларусі. На нашай зямлі гераічна загінуў выдатны сын грузінскага народа паэт Мірза Гелавані, а магілу яго праз шмат гадоў адшукалі беларускія піянеры. Мужнасць і гераізм савецкіх людзей на Беларусі тых палымяных гадоў апяваюць Х. Берулава, Ал. Каландадзе, Д. Квіцарыдзе, Д. Іўардава. Шмат гадоў жыве і працуе на нашай зямлі пісьменніца Т. Цулукідзе.

Паасобныя вершы пра Грузію напісалі Я. Колас, П. Броўка, М. Танк, А. Лойка, Н. Тулупава. У галіне крытыкі і літаратуразнаўства актыўна працуюць К. Квачантырадзе, С. Кекелідзе, В. Рагойша, В. Нікіфаровіч. З творамі братняй літаратуры знаёмяць нас А. Звонак, М. Хведаровіч, Р. Барадулін, Я. Семяжон і іншыя.

Асаблівае значэнне для ўзаемаўзбагачэння нашых літаратур набывае справа мастацкага перакладу. У апошняе дваццацігоддзе на беларускай мове выйшлі творы М. Гелавані, Х. Берулавы, А. Іаселіані, а ў перыёдыцы — вершы В. Пшавелы, Н. Бараташвілі, Н. Каландадзе, К. Каладзе. Па-грузінску загучалі аповесці В. Быкава, раман І. Мележа «Подых навальніцы» і вершы беларускіх паэтаў...

**— Што паўплывала на ваша рашэнне вывучаць грузінскую мову і літаратуру?**

— Хачу адзначыць, што старажытная гісторыя, багатая культура і асабліва самабытная мова і літаратура, першы вядомы пісьмовы помнік якой датуецца аж 5 стагоддзем н. э., даўно цікавілі мяне, студэнта-філолага. Паміж Тбіліскім і Беларускім дзяржаўнымі універсітэтамі існуе дамоўленасць аб узаемнай падрыхтоўцы спецыялістаў. Дарэчы, Нана Гапрындашвілі і Вахтанг Салія, што стажыраваліся ў Мінску, паспяхова працуюць на радзіме ў Музеі дружбы народаў. І калі мне прапанавалі ехаць у Тбілісі, з радасцю даў згоду.

**—Нашым чытачам цікава было б даведацца пра новыя набыткі літаратараў Грузіі.**

— Галоўныя заваёвы сучаснай грузінскай літаратуры бачацца мне ўсё-такі ў прозе. Атар Чыладзе, больш вядомы раней як паэт, выдаў вось ужо тры раманы: «Ішоў па дарозе чалавек», «І кожны, хто сустрэнецца са мной», «Жалезны тэатр». На жаль, беларускія аматары кнігі пакуль што не маюць магчымасці пазнаёміцца з выдатным раманам Чабуа Амірэджыбі «Дата Туташхія», затое на паліцах кнігарняў з'явіўся новы твор Г. Дачанашвілі, які мае ў рускім перакладзе назву «Одарю тебя трижды». Пра новую хвалю цікавасці да мінуўшчыны сведчыць выхад гістарычнага рамана Р. Джапарыдзе «Цяжкі крыж».

**— Апошняе пытанне будзе традыцыйнае: планы на будучае...**

— У Грузіі я дбаю аб прапагандзе лепшых здабыткаў нашай літаратуры, імкнуся садзейнічаць іх найлепшаму ўзнаўленню і выхаду ў свет.

Зараз прымаю сціплы ўдзел у падрыхтоўцы двухтомнай анталогіі грузінскай паэзіі, што павінна выйсці ў наступным годзе ў выдавецтве «Мастацкая літаратура». Пераклаў для дзіцячых выданняў некалькі грузінскіх народных казак. Распачаў работу па перакладу рамана Надара Думбадзе «Закон вечнасці», у якім ставяцца важныя маральныя і філасофскія праблемы нашых дзён.

Прапануем чытачам верлібр Гігі Сулакавуры і некалькі пяцірадкоўяў Нугзара Каберыдзе ў перакладзе Уладзіміра Сіўчыкава.

### *Гігі СУЛАКАВУРЫ*

**ВЕЧАР НА МОРЫ**

**Нікому не замінаюць**
**маленькія цёмна-шэрыя кажаны,**
**падобныя да тэатральнага**
**бінокля**
**на ліловым аксаміце небасхілу.**
**Гарачы вецер...**
**Белая сцежка**
**вядзе да вялізнай**
**бетоннай скрыні,**
**адкуль тры старыя пальмы**
**вывяргаюцца фантанам.**
**Нібыта ўсё жыццё**
**я гляджу на гэтыя дрэвы**
**і толькі зараз,**
**гэтым вечарам,**
**зразумеў,**
**як узмацняе**
**іх існаванне**
**спякоту.**

### *Нузгар КАБЕРЫДЗЕ*

Гэтую вуліцу, як даўняе паданне,
Цяпер амаль усе забылі.
Толькі старыя,
стомленыя тлумам горада,
Любяць тут шпацыраваць,
Каб успомніць далягляды
юнацтва.

* * *

*Жнівень, лілова-чорная смоква*
*спее.*
*Быццам арэх з лупіны,*
*вылузваецца сонца.*
*Юнакі гедзьве пераводзяць дух.*
*Калі міма праплывае твая*
*белая сукенка.*
*Жнівень, лілова-чорная*
*смоква спее.*

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.

19 чэрвеня 1986 г.

АТ 07264. Зак. 768.

*220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 72-73.*
*ТЭЛЕФОН 20-68-27.*

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЕЎ.